

Уладзімір Васько нарадзіўся ў вёсцы Ліпічанка Шчучынскага раёна. Служыў у войску на поўначы. Скончыў Гродзенскі педінстытут (зараз універсітэт) імя Янкі Купалы.

Працаваў у рэдакцыях Шчучынскай (1959 – 1960 гг.), Дзятлаўскай (1967 – 1972 гг.) і Лідскай (1972 – 2000 гг.) раённых газет. Жыве ў Лідзе. Друкуецца ў рэспубліканскім, абласным і раённым друку.

Выдаў кнігі “Прасветленасць” (1981), “На схілах берагоў” (1997), “Кругаварот жыцця” (2011), “Лясная рапсодыя” (2013), “Зігзагі лёсу” (2017), “Энергія душы” (2018), “На перавалах часу” (2021), “Неабдымнае” (2023), “Салаўіная радасць” (2024).

Уладзімір
Васько

# БАЙКІ

Ліда
Лідская друкарня
2026

pawet.net

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-7
В19

**Васько, У. Г.**

В19 Байкі / Уладзімір Васько. – Ліда : Лідская друкарня, 2026. – 136 с.

ISBN 978-985-6437-85-7.

Новая кніга Уладзіміра Васько “Байкі” запрашае ў адмысловы гумарыстычна-сатырычны свет, у якім існуюць розныя жывёлы, птушкі, насякомыя. Яны паводзяць сябе падобна да людзей: то пахваляюцца сваімі выдуманымі талентамі, здольнасцямі, то падхалімнічаюць, то хлусяць. Такім чынам ў алегарычнай форме аўтар высмейвае чалавечыя заганы, прымушае задумацца над мэтай і стылем асабістага жыцця кожнага чытача.

Прысутнічаюць у кнізе і гумарыстычныя гісторыі з жыцця людзей.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-7**

**ISBN 978-985-6437-85-7**

© Васько У. Г., 2026
© Афармленне.
ГАУПП «Лідская друкарня», 2026

## *РЫБАК І КАЛЮЧКА*

Абступілі лідскія азёры
ў гумовых ботах рыбакі,
ды ўцёк кудысь карась мацёры,
зніклі краснапёркі, шчупакі.

Гойдаюцца паплаўкі на хвалях,
не ідуць раптоўна пад ваду.
Хітрымі і рыбкі сёння сталі,
не клююць на ўсякую брыду.

Замахнуўся дзядзька зноў вудзілам:
хочацца хоць што з вады дастаць.
Каб пакласць да ранку ў халадзільнік,
ці на рынку за рубель прадаць.

І, глядзі, нібы пашанцавала:
паплавок штось павяло ўбок –
і ў паветры ўжо затрапятала
рыбка, мо з гарохавы стручок.

І ўзмалілася калючка: “Слаўны!
Адпусці! Што хочаш я зраблю.
Я табе і пенсію прыбаўлю,
і марнатку новую куплю”.

Толькі дзядзька верыць
не збіраўся,
быў ён хітры і не раззявак,
нешта ў галаве пакалупаўся
і прамовіў, апантаны, так:

“Развяла свае тут тралі-валі.
Хоць была б пародзістай,
як лешч.
Мне марнатку карпы абяцалі…
Буду я ў старой рыбачыць лепш”.



## *ВЕПР, АСЁЛ І СЛОН*

Мы выпівалі ўсе, не піў адзін асёл.
Барсук разносіў тлустай лапай
шклянкі.
Мінут пятнаццаць тост трымаў казёл,
шашкі смакталі з фільтрамі цыгаркі,
закускаю не песцілі сябе.
Вавёрка піва смакавала ў роце.
Занадта зацягнуўся наш абед –
начальнік-слон злаваўся на рабоце…
Асёл пад вечар расказаў слану,
дзе мы былі і што аб ім казалі,
як лазіў п'яны вожык на сасну,
як воўк з ласём казулю цалавалі.
Слон выклікаў назаўтра да сябе
зачыншчыка банкета – вепра:
– Ну,  як настрой, ці смачны быў абед,
пілі гарэлку, каньячок ці вермут?
Вепр хмурна глянуў з-пад ілба і так
пачаў непалахлівую гаворку:
– Пілі, начальнік, піва і каньяк,
замочваў я сваю другую жонку.
– А што яна, як тая ўцячэ?
– Вядома, не. Але сябры… насталі…
Ды во ў мяне ёсць каньячок яшчэ.

Магчыма, ў добры час паспрабавалі б?
Слон паглядзеў, падумаў, памаўчаў,
пасля пасунуў хобат ў сейф па
шклянку
і падабрэў прыкметна ў вачах,
і вынуў на закуску шакаладку.
Настрой ў слана падняўся хоць скачы,
і ў вепра на душы спакойна стала…
Адзін асёл астаўся тут ні з чым:
свайго начальніка ён ведаў вельмі
мала.



# *АГРЭСАРКА*

Узвыла бура воўкам над ракой:
– Дуб, я скручу цябе адной рукой
і абарву лістоты медны чуб.
– Кароткая спаднічка, – мовіў дуб. –
Мяне яшчэ ніхто не перамог.
Я ад грамоў магутных не аглох.
А бура, нібы звар'яцелы кат,
хваліцца пачала ў той дзень зашмат:
– Я зараз як рвану, як зараву,
цябе пастаўлю з ног на галаву.
І стала голле цвёрдае круціць,
паветра па-над Нёманам муціць
ды надарвала толькі свой пупок:
дуб устаў у горле буры папярок
і паламаў ёй зубы папалам.
А свет спісаў агрэсарку на хлам.
Хто не ўмее сілы вызначаць,
таму лепш не хваліцца, а маўчаць.



## *АДМОВА*

Вавёрку дзяцел ранкам разбудзіў.
Не злосная яна, ды крыкнула наўздзіў:
– Ты што тут стукаеш, як дурань
малатком?
Птушынае шукаеш малако?
– Ды не, казуркі выбіраю я.
Яны  яда найлепшая мая.
– Ну і знайшоў яду, дзюбаты хмыр.
З казурак дохлых ладзіш сабе пір…
Я дык арэхі цвёрдыя грызу.
– Грызі, грызі, – сказаў пярнаты зух. –
Але не псуй мне лепей апетыт,
бо стукну дзюбам – паляціш з капыт.
– Ах ты мяне палохаць, фраер, стаў!
Я вырву пер'е ўсё з твайго хваста.
Не зможаш апірацца на сасну,
трывожыць майго ранішняга сну.
– Не злуйся, мілая, за словы мне
прабач
І не бяжы з галінкі на галінку ўскач.
Давай лепш абмяняемся жыллём.
Махну рукой я на сваё галлё.
– Я не мяняю на тваё жытло
сваё ўтульнае і цёплае дупло.

# *ВАЙНА*

Дзед здатнае карыта змайстраваў.
Бабулька ў яго наклала страў.
Аднекуль прыцялёпкаўся гусак.
Прыбег ад свірна певень – не
прастак.
Гусак у ім саперніка адчуў
і моцна за крыло яго ўшчыпнуў.
Бы ў Карабаху ўспыхнула вайна.
(Ці не ў карыце тым была віна?)
То певень асядлае гусака,
то ў бок гусак падсуне сувака.
І так цягнулася між імі барацьба,
пакуль абоім дзед не ўрэзаў па чубах.
Разбегліся ваякі ў два бакі.
І між людзьмі нямала ёсць такіх.



## *ДЗВЕ ДУМКІ*

Сабака надта злосны на ката
і лічыць: кот – апошняя брыда,
бо да прахожых лезе з просьбай
"дай"
і мяўкае сто раз "не абмінай".
"Во некалі, – скажу – былі каты:
у вёсках лазілі цераз платы,
мышэй лавілі, тлустых пацукоў
і не вымольвалі на кухні панцакоў.
А зараз мышы ім не ў галаве,
валяюцца ўсё лета на траве.
Пагрэюць пад свяцілам два бакі
і мараць пра вяршкі і балыкі.
Не, не люблю я ўсё-такі катоў.
Лепш, каб яны жылі паменш гадоў".
А кот пад ліпай разважаў вось так:
"Што ні кажы, я не люблю сабак.
Чаго яны ўсё брэшуць "гаў" ды
"гаў"?
Бо хочуць, каб ім хтосьці штосьці
даў.
Во папрашайкі, а браты ваўкоў.
І прагнуць не хлябцоў, а кумпякоў.
Эх, каб былі ў мяне правы, я і за так
павыганяў бы з Ліды ўсіх сабак".

## *ДРАПЕЖНЫ ШЧУПАК*

На дне ракі стаіўся ціха рак
і да яго  падплыў пражорлівы
шчупак.
– Во трапіўся абед мне у добры час,
Я адарву твае кляшні ўраз.
– Падавішся, – адрэзаў смела рак. –
І не такіх я бачыў забіяк.
Кляшнёй цябе за жабры як схаплю
і легка на спіну перакулю.
– Ты нешта ерапеніцца стаў, рак.
Я зараз як здушу цябе за карк –
успомніш пра бабульку і дзядка,
адчуеш хутка хватку шчупака.
Адкуль жа ты ў маю ваду прыпоўз,
каржакаваты, нехлямяжы смоўж?
– Я не прыпоўз, а так, як ты,
прыплыў.
Тут мой прапрадзед адмыслова жыў.
Так што пакуль я добры, уцякай, –
рак папярэдзіў строга шчупака.
– Ты ўжо дастаў мяне, зануда-рак!
Я зараз раструшчу цябе, як мак, –
прамовіў і зрабіў па слову так
цар прэснаводных рыб – шчупак.
Драпежнікаў хапае і ў вадзе,
дзе толькі з'явяцца, чакай, што быць
бядзе.

## *ДЫЯЛОГ ТРУСА І ЗАЙЦА*

Трус неяк ранкам зайцу пазваніў:
– Ну што ты, братка, гэтай ноччу
сніў?
– Ат, страляніну, брэх сабак
і быццам воўк пранік у наш барак.
Адны трывогі. Сон мой, як не сон,
аж у вушах стаіць якісьці звон…
– Бо ты труслівы, заяц, як-ніяк...
Вось што табе хачу параіць я:
не бойся ні звяроў і ні людзей –
і неба ад цябе ўсе беды адвядзе.
Чаму нікога не баюся я?
Гуляю ціха, мірна ў гультая,
сяджу спакойна ў клетцы,
жыў, здароў,
і насмаркаць мне на ўсіх звяроў.
– Дык ты ў клетцы? Гэта ж не
жыццё…
А я люблю вятроў выццё,
свабоду, поле і прастор,
зялёны гай, смалісты бор.
Корм здабываю ўсюды сам
і не зайздрошчу вам – трусам.
Цябе ж спадар у цемя – цюк
і прыйдзе што? Браток, каюк.
А я ў лесе ці ў кустах
змагу пражыць гадоў да ста.

## *КРАДЗЁЖ*

Дразды ўнадзіліся вішні красць
у дачніка па прозвішчу Карась.
А ён на іх усё махаў калом,
яны ж ляцелі проста напралом.
Пад раніцу Карась звычайна спаў,
бо ноччу кнігі пра вайну чытаў.
Дразды казалі ў лесе: “Глянь,
не спіць.
Чаму ў яго акне агонь гарыць?”
Здавалася: Карась закайфаваў –
і тут драздам сапраўдная лафа.
Крадуць у спешцы смачныя плады,
пакуль унук не прыбяжыць сюды.
Тады ляцяць у лес. А што рабіць,
бо ўнук пачне ўпопуск кіем біць.
Навешаў на галлё дзед лахманоў,
ды й гэта не палохала драздоў.
Карась са злосці вішні спілаваў –
не будзе мне, але не будзе й вам...

## *ЛАСТАЎКА І КАРШУН*

Па спрыту роўных ластаўцы няма,
ды кінулася ў вочы каршуну яна,
і ён пакляўся вёрткую злавіць
і кіпцюры і дзюб пачаў вастрыць.
Нарэшце, навастрыў і ў неба ўзмыў,
над ластаўкай мінут мо пяць парыў.
Пасля рвануў уніз, нібы страла,
ды ластаўка імгненна ўцякла.
Тады каршун з травы рашыў напасць,
а ластаўка між дрэў у неба – шась.
Запыхаўся драпежнік даганяць,
ды нораў свой ніяк не мог суняць.
Паспрабаваў накінуцца з хмары
і думаў, што ўжо птушку замарыў.
Але яна нарэзала паўкруг –
каршун з разлёту ў балота – бух.
Не, не злавіў ён ластаўку тады,
набраўся толькі стомы і нуды.
Хоць смелы, пан каршун, хоць і
круты,
трымайся ў баку ад вёрткіх ты.

# *МУРАШКА І КАМАР*

Канфліктаваў з мурашкаю камар,
казаў: “Я даляцець магу да хмар.
А ты ўсё поўзаеш унізе, па зямлі.
І як цябе трымаюць дрэў камлі?!
Хто я? Крылаты верталёт,
раблю вертыкальны ўзлёт.
А ты й на пядзю ўгору не ўзляціш.
Цябе расціснуць можа нават мыш”.
“Ах ты, камар, лясное памяло! –
Мурашку нібы хваляй падняло.
І што цябе ў бор наш прывяло?!
Ты тут жывеш, нібы бяздомны бомж.
Цябе ніхто не цэніць ні на грош.
А я сама сабе раблю жытло.
Сумленне маё чыстае, бы шкло.
Ты ж толькі кроў людскую прагна
п'еш,
а пра мяне паэт нашмальцаваў ужо
верш.”
Замоўк, заціх замораны камар,
растраціў слоў запас і зерне мар.





## *ПУСТЫ СОН*

Ліса прысніла і ўзяла ў толк,
што спадабаўся ёй багаты воўк.
А ён хваліўся: “Маю “Мерседэс”
і над ракой грыбны ўласны лес.
Катэдж узвёў на паўгектара мо,
сам выпрабляю дома “Эскімо”.
Даляраў шмат трымаю за мяжой,
заможны я і з добраю душой.”
Ліса паверыла і клюнула на ўсё –
вялікага кахання ўзнік касцёр.
Жывуць яны, бы ў казцы ці ў раі,
спяваюць песні ў сэрцах салаўі.
Прачнулася ліса – ваўка няма,
а на двары галодная зіма.



## *РАЗВАЖАННІ ВЕРАБ'Я*

Вяртлявы, шэры верабей
падумаў гэтай ноччу пра сябе:
“Чаму сваё гняздо раблю я сам,
а людзі ўзводзяць домікі шпакам?
Як гэты чорна-шэры шпак
падмазаўся да чалавека так?
А я нібы давер не заслужыў,
хоць тысячы гадоў пры людзях жыў.
Несправядлівасць усё-ткі на Зямлі...
Калі яе прыдбаем мы, калі?
Люблю бязмерна раннюю вясну,
ды ў клопатах вясной мне да сну.
А шпак на ўсё гатовае ляціць,
яшчэ і нада мной спрабуе кпіць,
што нібы я непаўнацэнны птах,
што на мяне каты наводзяць жах.
Няхай і адчуваю пэўны страх,
але ж і ён не дасць ім па зубах.
Па шчырасці сказаць хачу я вам,
што шпак – яшчэ і той драпежнік
сам,
бо душыць непрыкметных чарвячкоў
і корміць імі кволенькіх шпачкоў.
А я збіраю крошкі бы ікру,
не прападаць жа ўсё-такі дабру.
Зусім не справядлівы гэты свет –
адсюль так многа на планеце бед.

# *КАРШУН-МАХІНАР*

Каршун у давер да птушачак улез,
паклікаў іх на гнуткія галіны
і распавёў на ўвесь дрымотны лес:
“Я добры, я пакладзісты, я мірны.
Жыву я вунь на той старой сасне,
што месціцца каля высокай ёлкі.
Вы быццам бы баіцеся мяне?
За лісцікі хаваеце галоўкі.
Але дарэмна: я ўжо не такі.
За зіму пастарэў і памяняўся,
і кіпцюры змяніў на башмакі,
і спрыт мой прытупіўся, я суняўся.
Ніколі вас не буду зачапаць,
на дрэвах можам дружна ўжывацца
і на адной галіне нават спаць,
высока ў неба разам уздымацца”.
І птушкі клюнулі на гэты кліч,
падумалі: “Магчыма, праўду кажа,
і дзюб яго ступіўся, стаў, як лыч,
і крылы, бы не крылы, а паклажа”.

Але не бачыў з іх тады ніхто,
што ён на ногі начапіў дзве шышкі,
а дзюбам пракалоў сухі лісток,
які і прынялі за лыч малышкі.
Паразрываў каршун тых птушанят
(драпежнікі паўсюль, заўжды ліхія)
і накарміў галодных каршунят, –
так паплаціліся за свой давер малыя.
І між людзьмі бывае часта так:
пабожыцца вам новенькі сустрэчны,
што ён і міласэрны, і дабрак –
пасля вас абкрадзе, яшчэ й знявечыць.



## *МУХА І ПАВУК*

Сказала муха павуку
у спальні, у глухім кутку:
“Не хітры, не рухавы ты, павук.
Чаму не падаеш які хоць гук?
А я, паслухай, крыльцамі звіню
і сесць магу на мёд і на свінню.
Я й чалавека ўмею ўкусіць
і за абедам спрытна абхітрыць.
Хоць кроплю, а ўкраду ў яго яды
і ведаю пасля ўцякаць куды.
У фортку, што адчынена лячу
і на двары ніколі не маўчу,
усім сяброўкам крыльцамі званю:
“Не бойцеся на кухні вы агню.
Ляціце, каб усмак паесць, папіць.
Там п'яны за сталом мужык сядзіць,
яго вам будзе проста абхітрыць.
Ён хоць махае вяла ручнічком,
ды вы каля яго бачком, бачком.” –
“А на цябе й алкаш наводзіць страх,
ты ўсё туляешся ў спальні па кутках”.
Павук пакрыўдзіўся і голас свой
падаў:
“І я бываю тут і там…

Ты хітрая, але не дурань я.
Вы мухі ўсе – нахлебнікаў сям'я.
Вось толькі зараз сетку дапляту –
і сцапаю цябе я наляту”.

*03.11.2019*



## *САРОКА І ЗЯЗЮЛЯ*

Пакуль сарока па яду лятала,
зязюля ёй у гняздо яек наклала.
А тая не лічыла колькі іх
і не адкінула чамусьці ад сваіх.
Добрасумленна грэла пад сабой
квітнеючай вясной лясной.
Прабілі птушаняты шкарлупу
і ўбраліся ў шэры мяккі пух.
Сарока іх лічыла за сваіх –
ну гэтых самых птушанят чужых.
Карміла іх аднолькава ўсіх,
старалася, каб найхутчэй раслі.
Але, як тыя сталі на крыло,
іх нешта, як мятлой, з гнязда змяло
і да зязюлі-маці прывяло.
Сарока не змагла іх палавіць,
крычала толькі: “Пыць, пыць, пыць”.
Назад не павярнула ні адно –
вось вам зязюльчына кіно.
Спытайце ў двуногіх вы зязюль:
”Адкуль ідзе такі інстынкт, адкуль?”

*03.11.2019*

## *ПЧАЛА І ЖУК*

У кучы смецця капашыўся жук.
Ды што ён там шукаў – я не скажу.
А побач кветка белая цвіла,
і села на яе залётная пчала.
І жук давай малую дакараць:
– Зладзейка, зноў рашыла рабаваць?
І як табе не сорамна, скажы,
абкрадваць кветкі на маёй мяжы?
Пчала сказала:
– Жук, ты абармот.
Ты вымазаў сабе ўвесь жывот
і мыцца да ракі не паляціш.
Чаму над мною гэтак кпіш?
– Пчала, – працягваў сонны жук, –
кажу я праўду зараз, не хлушу,
зусім не падабаешся ты мне.
Ад злосці на цябе я пачарнеў,
бо ты худая, як асотны пух,
а я, глядзі, які таўшчэзны зух.
– Я хоць худая, ды прыношу мёд.
А што прыносіш ты, таўшчэзны
ідыёт?”

*10.11.2019*

## *КРУМКАЧ І САЛАВЕЙ*

Так заспяваў у лесе салавей,
што спадабалася вавёрцы і саве,
і нават апантаныя дразды
зляцеліся, бы на канцэрт, сюды.
Але крумкач не слухаў салаўя,
лічыў: “Галоўны ў акрузе я”.
І выдаваў тужліве “крум-крум”,
што заглушала нават елкі шум.
Мелодыі ў тым “круме” ані-ні,
бы ў рохканні адкормленай свінні.
І выгукнуў у нецярпенні дрозд:
“Крумкач, ты да саліста не дарос!
Не псуй настрой і нам, і салаўю,
і сонечнаму, радаснаму дню”.
Вы думаеце: той крумкач замоўк,
на дзюб навесіў зношаны замок?
Яшчэ мацней стаў крумкаць,
чым раней,
што аж збянтэжыўся
няшчасны салавей.
Ці чулі вы ў зале, пры агнях,
у тым стагоддзі, сёння ці на днях,
як заглушае крумкачоў сям'я
вялікага саліста салаўя?

*12.03.2020*

## *СЛІЗНЯК*

Да яблыні прыклеіўся слізняк.
Заснуў ён тут ці проста так абмяк?
Не рухаецца, з-пад ілба глядзіць,
нічым не можа дачніка здзівіць.
Вакол спяваюць птушкі, лес
шуміць, кудысьці верталёт над ім
ляціць, рухавыя таўкуцца камары,
а ён не адарвецца ад кары.
Учора так сядзеў і сёння – зноў.
І што ён тут забаўнае знайшоў?
Ні з кім не уступае у кантакт,
усё жыццё яго – сплашны антракт.
Які ён так набудзе кругагляд,
калі за век свой не абыйдзе сад?
Натхненне абмінае слізняка,
ніхто не прызнае ў ім сваяка:
цураюцца казуркі, машкара,
бо ў яго адна любоў – кара.
І чалавек бывае, як слізняк:
не адарвецца ад віна ніяк.

# *СКУПЫ ЧМЕЛЬ*

Чмель ганарліва глянуў на пчалу
ну і давай выпытвацца: “Чаму
чаму ты носіш людзям дарма мёд,
і што табе ўзамен дае народ?
Я дык хаваю мёд свой у кустах,
каб аніхто яго не змог дастаць”.
Падумала, прыкінула пчала
і свой аповяд зважна пачала:
“Ах, чмелюшка, я так люблю людзей!
Без іх не абыйсціся анідзе.
Нам здатна вуллі робіць чалавек,
якіх хапае на цалюткі век.
Ён сее рапс, грачыху, агуркі,
такі працалюбівы, уважлівы такі.
Чаму ж яму не адплаціць дабром?
Хай есць мой мёд з духмяным
пірагом.
Ах, чмелюшка, ты круглы скупянда
ці, кажучы прасцей, з брыды брыда”.
Чмель нешта прабубніў сабе пад нос
і мёд украдкай у кусты панёс.
Разгледзьцеся, прыкіньце ў галаве,
у кім з нас чмель, а ў кім пчала жыве.

*16.11.2020*

## *ДАПАМОГА*

У полі сход распачалі казлы,
рашалі, як пазбавіцца ад воўка,
і вось адзін з іх, самы пажылы,
прамовіў гучна і каротка:
– Давайце клікнем з лесу вепрука,
ён можа біць з разбегу і імпэтна.
Галоўнае – перакуліць ваўка,
а там мы з ім расправімся імгненна.
Вяпрук на запрашэнне згоду даў.
Прыбег, абмеркавалі ўсе дэталі,
і ён за стог саломы скрытна стаў,
ну а казлы траву сабе шчыпалі.
Праз колькі часу паказаўся воўк,
галодны, палінялы, шэры, гадкі.
Вяпрук рвануўся, даў клыком у бок
і распластаў звярыну на лапаткі.
І тут падбеглі бойкія казлы
і нанясли шматлікія паломы.
Так і загінуў воўк – драпежнік злы –
і ціха стала ля стага саломы.

Калі й на вас хто-небудзь нападзе,
паклічце вепрука на дапамогу:
ён не пакіне вас нідзе ў бядзе –
зласліўца кіне ў поўную знямогу.

*21.11.2020*

## *НОВАЯ ВАЙНА*

Дэбаты вёў сабака з бараном,
(пры гэтым частаваліся вінам),
хацеў пераманіць яго ў свой полк,
дзе камандзірам быў мацёры воўк.
– А воўк мяне не з'есць? – спытаў
баран.
–Ты, пры выпадку, пойдзеш на
таран.
Ды не хвалюйся, ён жа неблагі,
хоць і на вушы некалькі тугі.
І вось разбушавалася вайна,
і вораг пёр на іх, бы сатана.
Лавінай шлі ў атаку барсукі,
за імі як падмога – вепрукі.
– Наперад! – закрычаў палкоўнік-воўк
і барана штурхнуў у левы бок.
І той пайшоў крушыць пярэдні рад,
аж падаліся барсукі назад.
Але ўступілі ў бойку вепрукі,
павыставіўшы вострыя клыкі.
Воўк кінуў у атаку ўсіх сабак,
сабраўшы іх у баявы кулак.
Цягнулася гадзін мо пяць вайна,
амаль усім у ёй прыйшла хана.

На полі бою ад шматлікіх ран
канаў адважны малады баран.
Валяліся сабакі, барсукі,
павыбіваныя ў вепрукоў клыкі.
Сцякалася ў разоры ціха кроў,
у смерці быў неспадзяваны ўлоў.
А воўк папёр у пушчу барана –
так скончылася новая вайна.



## *БАБЁР І ПІЎЗАВОД*

Скупая жонка ў рыбака Бабра:
на піва і рубля не выдзяляе.
Ён не чакае ад яе дабра,
бо ведае: урадзілася такая.
Ды іншы раз як заскрабе ўнутры,
што хочацца кульнуць, хоць
паўнапарстка:
– Ну дай, Параска, хоць рублякі тры. –
А дулю бачыў! – выкрыкне
Параска.
Тады Бабёр той вудачку бярэ
і крочыць на ўсход ад піўзавода:
сюды заходні вецер прэ і прэ
піўную пару, бы туман з балота.
Сінее неба велічны шацёр,
а ўнізе аблачынкі, як талеркі...
Нанюхаецца пары тут Бабёр –
і захмялее больш, чым ад гарэлкі.

*01.12.2020*

# *ВЕРАБЕЙ-ПАЭТ*

Сеў верабей, каб намазюкаць верш.
Задумаў тэму падабраць найперш,
але нічога ў галаву не шло,
хоць наваколле фарбамі цвіло.
Направа гляне – рэчка зіхаціць,
налева – вёска пры барку стаіць.
Пра гэта ўжо паспелі наплясці.
Патрэбна штосьці новае знайсці.
А што? Вунь, бачыць, чорна-белы
конь.
Магчыма, ён гарачы, як агонь.
І крылы ў яго, напэўна, ёсць,
а тут ён проста выпадковы госць.
А раптам гэты здатны конь – Пегас,
мне дапаможа ўзняцца на Парнас.
Давай-тка да яго я падлячу
і на эпітэты і рыфму раскручу.
І верабей каню на спіну сеў
і зацягнуў прашэнне на распеў:
“Пегас мой родны, ты ўяўлення ўзор,
дапамажы мне намазюкаць твор,
каб стаць паэтам важкім, выбітным,
не звязвацца над рыфмай са
спіртным.”

А гэта быў звычайны, просты конь,
які выцягваў возам з фермы гной,
які не ведаў аніякіх моў.
Ён вераб'я хвастом, як муху, змёў.

*09.12.2020*



## *КАНФЛІКТ НА АРЭШЫНЕ*

Адзін выпадак маладую сойку
прымусіў наваліцца на вавёрку.
Яе абурыла, як рыжанькі звярок
ёй выказаў зняважлівы папрок.
– Ты што мае арэхі, сука, рвеш,
на зіму назапасіць не даеш?
Што, не хапае спелых жалудоў?
Цягай у дзень іх хоць па сто пудоў.
Тут сойка падляцела ўміг бліжэй
і стукнула вавёрку між вушэй:
– Ты хутка скажаш, што твой лес і
дол,
і ўсё зграбсці захочаш у прыпол.
Не, рыжая, арэхі не твае.
Яны, спытай у лесніка, мае.
Я іх найперш хаваю ў зямлю,
пасля, як паляжаць, ужо луплю.
Але забуду іншы раз, дзе клад, –
тады расце арэшнікавы сад.
Так вось арэшнік размнажаю я,
і гэтая арэшына мая.
Ну што, кудлатахвостая, дайшло?
Цяпер скачы, зладзейка, у дупло.

Чыя тут праўда – цяжка разгадаць:
арэхі і вавёрка здольная хаваць.

*12.12.2020*

## *МІКРОБ І СЛОН*

Хваробатворны, подленькі мікроб
прысеў слану вушастаму на лоб і
прыгразіў:
– Цябе я павалю і скуру з цябе
тоўстую злуплю.
– Замоўкні, каратыш, – прамовіў
слон. –
Я важу дзевяноста з лішнім тон,
а ты зусім, напэўна, без вагі.
Я мільёны растаптаў такіх.
Вось зараз хобатам сцягну ўніз –
і скончыцца твой гномаўскі капрыз.
– А я ў твой страўнік прабяруся,
слон,
і прывяду сваіх сяброў трыльён.
Хвароб раздуем на ўвесь бэбах твой,
пачнем з табой там рукапашны бой.
І гэты гном, па праўдзе, так зрабіў:
слана з паплечнікамі загубіў.
Мікробы, ясна, не раўня сланам,
ды з імі лепш не звязвацца і нам.

*15.12.2020*

## *АБРАЗА*

Крот пад зямлёй мятро сабе праклаў
і носіцца па ім туды-сюды,
жыве і не сумуе без вады,
а так хапае розных свежых страў.
То чарвяка ён нашча ўпляце
(неблага, што чарвяк хоць без
касцей),
то карані ў радыскі падгрызе.
Адно, што ў жаніцьбе не вязе.
І неяк да яго ў мятро пранікла мыш:
– Ну што ты тут, бы ў камеры,
сядзіш?
Я й на паверхню бегаю ў начы,
шукаю больш прыдатныя харчы.
– А я ўжо прывык жыць ў цемнаце.
Там буду ў кажушку сваім пацець.
Выходзь, мышака, замуж за мяне,
па-царску ў гэтым доме зажывем.
– Я ўжо замужняя, – сказала ціха
мыш.
– Вазьмі развод і зноў сюды бяжы.
– Я не такая. Будзем лепш дружыць
і дружбай нашай цёплай даражыць,
– Ну, гэта як абраза для мяне.
Я прападу ад гора ў віне.

*21.12.2020*

## *НА ПЛАНЕЦЕ УРАН*

Казёл прысніў, што ў космас паляцеў
і трапіў на загадкавы Уран.
Хадзіў, шукаў яды, пацеў,
і раптам перад ім узнік баран.
– Ну, як жывеш, зямляк, спадар
баран? –
спытаў крыху збянтэжаны казёл.
–Я толькі сеў. Вунь мой ракетаплан.
– І я тут мо з паўдня, як навасёл.
Так хочацца папіць, паесць травы…
Мо ў Вас вадзіцы знойдзецца хоць
збан?
– Не называй мяне, казёл, на “Вы”, –
прапанаваў з усмешкаю баран. –
Няма ў мяне і ні травы, і ні вады.
Я сам галодны, як пушчанскі воўк.
– Дык мы праз тыдзень здохнем без
яды, –
сказаў баран і праз хвіліну змоўк.
– А што рабіць? Такі нам выпаў лёс…
Авечка недзе плача дома, бы ўдава…
Не выцірай, казёл, каленам слёз,
хай капаюць, мо вырасце трава.

І тут узніклі быццам з-пад зямлі,
авечка з перахлябістай казой:
– Ах, вось куды вас чэрці занялі! –
і па рагах дваім давай лупіць лазой.
Баран зароў: “Не зачапай, не лезь!”
Ну а казёл прачнуўся ў поце ўвесь.

*22.12.2020*



## *СЛІЗНЯК, АРОЛ І ВОЛ*

Аблезлы, закажэнены слізняк
смярдзеў, бы ў цыстэрне аміяк,
ды галаву вышэй за ўсіх задраў,
як прэмію за твор свой атрымаў.
Вось прыляцеў з-пад воблакоў арол:
– Хто лаўрэат тут?
Ты, слізняк, ці вол?
– Я, я! – засоп, заслініўся слізняк. –
А вол не ўмее рыфмаваць ніяк,
і рытміка ў яго – курам на смех,
і проза, як вясенні рыхлы снег.
– Я іншай думкі пра вала, слізняк.
Ён самы каларытны, як-ніяк.
А твор твой – нагрувашчванне дзярма,
якога й у графамана мо няма.
Слізняк, хутчэй з літаратуры вон! –
сказаў арол. – З цябе смяецца вол.
– Чаму ж тады мне прэмію далі?
– Таму што ў журы адны аслы былі.

*03.12.2020*

## *ЧМЕЛЬ І МАТЫЛЁК*

Матляўся над капустай матылёк.
Тут прыляцеў масціты
чмель здалёк
і прабубніў пад позірк
буйных рос:
– Ты круцішся, як жвавы віртуоз.
– А ты гудзеш, як пыльны бензавоз. –
Чмялю не спадабаўся камплімент:
– Сказаў бы, як навейшы бамбавоз,
а то прыплёў якісьці бензавоз.
Вось зараз усаджу іголку ў нос –
забудзеш пра капусту й белы свет.
Бяры назад свой кіслы камплімент.
Ты першакласны шкоднік матылёк:
разводзіш на капусце чарвякоў.
Прыпаднясуць табе калісьці ўрок –
насадзяць пад вачыма сінякоў.
– А ты не лепшы, кацалапы чмель.
Вунь колькі кветак да зямлі прыгнуў.
І, як сказаў мне дачнік Капачэль,
не апыліў з іх летам ні адну.
І тут падбег той Капачэль Язэп:
– Давай зачынім матылька ў склеп,
няхай там пасядзіць у халадку.
А ты, чмель, прынясі мне грам мядку.

*20.12.2020*

## *САВА*

Даўно ўжо не пісалі пра саву,
а я яе зладзейкай абзаву.
Адкуль яна ўзялася тут і як?
Чым спадабаўся ёй наш ціхі парк?
Сядзіць, нахохліўшыся, на сасне,
нібы знаходзіцца ў моцным сне.
Не рухаецца, ўгору не глядзіць –
во дзе зануда, баравая дзіч.
І тут з'явіўся дворнік – нехта Кныш,
махнуў мятлою і сказаў: “Акыш!”
Саву ўзвінціла: “Я табе не мыш.
Мяці сваю лістоту і не ный,
ад бруду лаўкі да зімы адмый”.
Як нахіліўся дзядзька да травы,
сава сарвала кепку з галавы
і панясла ў цёмна-сіні лес,
а дворнік і худы, і лысы ўвесь
расплакаўся і пазваніў ласю,
і слёзна расказаў пра крыўду ўсю:
– Дапамажы мне кепачку вярнуць,
я на саву не буду болей дзьмуць.
– У птушак свой прэм'ер – стары
Крумкач.
Вось і звані яму. Ды і не плач.

І дворнік тут жа бракнуў Крумкачу,
а той аж схамянуўся як пачуў:
– Панок, прапала кепачка мая.
Сава яе паперла ў цёмны лес,
а я без валасоў, увесь аблез.
У нас палітыка – “адно акно”.
Пра гэта ведаем мы ўсе даўно.
– У вас адно, а ў нас, шаноўны, пяць –
і мне за год саву не адшукаць…
Так і застаўся з носам дворнік той
і бліскае аблезлай галавой.

*06.02.2021*



## *БУСЕЛ І ВЕРАБЕЙ*

Пагарднік-бусел на гняздзе сядзеў
і з подзівам аглядваў наваколле,
кідаў ён позірк на малых людзей,
на лес далёкі, на лугі і поле.
Тут падляцеў пытлівы верабей
і праспяваў на ноце простай, срэдняй:
– Ці можна, цар, знайсці яду ў цябе,
хоць крошку хлеба ці якое зерне?
– Я гэтых страў цураюся, не ем.
Лягушкі – вось дзе смаката і ежа!
Французы кажуць: шмат у іх жалеза.
Вунь лягушатнік – гэта мой эдзем.
– Ты з Францыі сюдэма прыляцеў?
– Ды не, я ў Орлі нарадзіўся, братка.
Тут верабей працвіркаў нараспеў:
– Ах, а мая радзіма Ліпічанка.
– Дык будзем сябраваць, братове мой,
і забаўляць унукаў той бабулькі.
А хто з нячыстых нам навяжа бой,
дык мы дадзім звыродышу на булкі.
– Мы можам сябраваць. Не супраць я.
Ды да лягушак у мяне агіда.
Няхай цябе не апануе крыўда:
ну не ляжыць да іх душа мая.

*12.02.2021*

## *БАБЁР-БРАКАНЬЕР*

Ішоў ляснік адзін уздоўж ракі
і бачыць дрэвы ў вадзе ляжаць,
на беразе адны шурпатыя пянькі –
і ён рашыў бабра аштрафаваць.
– А ну, грызун, вылазь хутчэй
наверх!
Ты ўзяў на душу нейпамерны грэх.
Вылазь, пакуль я добры да пары,
бо доўгім кіем выпару з нары.
Маўчыць бабёр. Варожыць,
што рабіць.
А чалавек пачаў па голлі біць.
Заплакалі тут бабраняты ўсе:
– Вылазь, бацяня, бо ён нас паб'е.
І вылез з хаткі шэранькі бабёр.
Ляснік яго нагой да пня прыпёр:
– Ты што тут дрэвы стройныя
падгрыз
і з берага пакідаў у ваду, уніз?
Плаці сто пяць рублёў за гэта.
Штраф!
– Даруй мне, шматшаноўны граф.
Я й пенсіі яшчэ не атрымаў,
а за душою і рубля няма.

Ды што вы апупелі ўсе? Ці што?
Нядаўна рыбнагляд аштрафаваў на
сто.
На вас не набяруся грошаў я.
А ў мяне вялікая сям'я, –
сказаў бабёр і булькнуў у ваду –
і гэтак, як здалося, лесніка надуў.
Але ляснік быў хлопцам не з такіх:
пачаў крычаць, свістаць ён ля ракі
і кіем тыкаць жвава там і тут –
і ўжо бабру нібы прыйшоў капут:
не паказаўся болей ён з вады.
Ці праўда гэта ўсё? Паразважай і
ты.

*21.03.2021*



## *ШЧАСЛІВАЯ ПАРА*

На сойку дзяцел позірк свой паклаў
і падлятаў на дзень па дваццаць раз,
начамі думаў пра яе, не спаў,
прыкідваў, як ім завітаць у ЗАГС.
Аднойчы ў нерашучасці сказаў:
– Каханая, навекі будзь маёй, –
і шлях на Ліду дзюбам паказаў. –
Паедзем і распішамся з табой.
Тут сойка разгубілася крыху.
Пасля спытала:
– Дзе мы будзем жыць?
– Дупло пашыру я, як надуху.
Ты ў ім не будзеш, мілая, тужыць.
Іх распісалі ў ЗАГСе ў той жа дзень.
Вяселле закацілі на ўвесь лес.
Віно па шклянках разліваў Прамень,
а сватам быў Каршун Галаварэз.
Ой, як ён тосты прамаўляў тады!
Чаго ён толькі пары не жадаў:
і каб жылі ў згодзе ўсе гады,
і каб было ў дастатку розных страў.
А сам між тым на сойку пагладаў,
ад дзятла планаваў яе адбіць.

Ды захмялеў і пад сасну ўпаў,
і зараз, мабыць, там яшчэ ляжыць.
А сойка з дзятлам добра зажылі.
ні ў чым адзін другога не віняць,
катэдж на хвоі здатны ўзвялі,
працуюць, не сумуюць а ні дня.

*22.03.2021*





## *ЛОСЬ-ЛАВЕЛАС*

Прывабіў лось казулю да сябе,
наабяцаў ёй залатыя горы:
"Ты будзеш тут царыцаю цяпер,
забудзеш аб сваім нядаўнім горы.
Цябе ганялі шэрыя ваўкі,
ліхія паляўнічыя сабакі,
палохалі знянацку вепрукі –
цяпер яны табе ўсе да брамкі.
Прыслугай стануць
той жа злосны воўк,
аматар да грыбоў – калючы вожык.
Вяпрук, адзенне ў залацісты шоўк,
ліса зайздросціць будзе, як
вяльможы".
І напачатку, праўда, так было.
Пасля ў блуд пусціўся лось сахаты,
зрабіўся, як апошняе хамло,
зусім адбіўся ад двара і хаты.
Завёў каханак ён ва ўсіх кутках
ляснога сакавітага абшару,
параздаваў усё дабро за так,
а ноччу п'яны па кішэнях шарыў.
"Ну вось што, мілы,
я адсюдь пайшла, –
прамовіла ў роспачы казуля, –
я лепшага казла, чым ты знайшла,
і вось табе на развітанне дуля".

*11.02.2021*

## *ЛІСА-ЗНАХАРКА*

Заробкі ў лісы пайшлі не згорш:
яна сябе знахаркай абвясціла,
і кожная задрыпаная вош
лячыцца да хітрункі паспяшыла.
Між тоўстых дрэў, кустоўя і галля
прыбег звідна, бы з перапуду, вожык:
– Бабулька, даражэнькая, паглянь,
які я ёсць. Мо ў горы дапаможаш?
– А хто ж цябе так здатна прыдушыў?
Усе калючкі паламаў дарэшты.
Ты можа дзе свядома награшыў?
Мо ў лася пакраў з паліцы вершы?
– Ды не, я лісце ў нару цягаў –
і тут наскочыў воўк, як леў, кудлаты
і больш гадзіны ўсё мяне таптаў,
і не баяўся, што паколе лапы.
Ліса іголкі выпрастала ўсе
і змазала яловаю смалою:
– Папрравішся, братове, пакрысе.
Будзь болей пільным, думай галавою.
– А колькі трэба, пані, заплаціць?
– На першы раз давай “дваццатку”,
братка.
Мо прыйдзецца калі яшчэ лячыць,
Прыходзь, ды толькі, як мага,
украдкай.

Праз тыдзень прыцягнуўся шэры воўк:
– Суседка, за мною гора адбылося.
Авечку з поля на плячах валок
і на калючым дроце пракалоўся.
Ліса ўсміхнулася і спакваля
агледзела ўсе чатыры лапы:
– Такога пра цябе й не сніла я.
Ну здорава ты іх, браток, падрапаў.
Ліса прамыла раны на нагах,
дала папіць зялёнага адвару.
– Ці вылечуся хоць? Аж цісне страх.
– Паправішся. Не налягай на згару.
– Не ведаю, як мне далей і быць…
А колькі заплаціць? Ці вып'ем чарку?
– Мне ад гарэлкі галава баліць.
Давай лепш, воўк, пакуль
“пяцідзесятку”.
Лячыліся ў лісы бабры, ласі,
дразды вавёркі, барадаты козлік,
барсук ёй грошай шмат перанасіў –
ды толькі не паправіўся ніхто з іх.

*19.03.2021*

# *ПЧАЛЯР, МЯДЗВЕДЗЬ І ЛІСА*

Пчаляр застаў мядзведзя пры вуллі.
– Ты што задумаў, кацалапы Мішка?
Ты пчол ні разу
цукрам не карміў,
а хочаш мёд дастаць,
як бульбу з прыска.
– Спадар пчаляр,
я многа не хачу.
Спатоліць прагу
і малая міска.
Я еўрыкамі тут жа заплачу.
Ды не скупіся, – узмаліўся Мішка.
– А дзе ты ўзяў
тых еўрыкаў, прахвост?
Абрабаваў, напэўна,
банк у Лідзе?
І іх схаваў пад той
драўляны мост,
які ўжо інкасатарам
абрыдзеў?
– Я раніцай пазычыў у лісы.
Яна зняла
працэнты з дзепазіта.

Мы з ёю дружым,
разам ноччу спім,
ямо прысмакі
з аднаго карыта.
Характар вельмі добры ў лісы.
І сёння грошай
не, не шкадавала:
сабе купіла новыя трусы,
а рэшту мне
на мёд ахвяравала.
– Бяжы, мядзведзь, адсюль,
пакуль крычу,
Табе не давяраю я нікольки,
бо зараз вось калом
як змалачу –
забудзеш пра лісу
і мёд салодкі.
Пабег мядзведзь
сцяжынкаю лясной.
Яго міліцыянеры
не дагналі б.
А ноччу з той
пакладзістай лісой
у пчаляра ўсе
вуллі пакралі.

*05.03.2023*

## *ПЕРАЛЮБЫ*

Перaлюбы дзяцел палюбіў
і лётаў ад сініцы да зязюлі.
Яго прымалі:
ён прыгожы быў,
насіў шматкаляровыя кашулі.
Ды пра сябе падумала сава:
а чым я горшая
за кволую сініцу?
І галава ў мяне, як галава,
і вочы могуць фарамі свяціцца.
Не, дзятла я
ўсё-ткі прыманю
ці праўдай, ці салодкаю маною.
Падкіну ўміг любоўнага агню –
і ён не ўстаіць перада мною".
Паціху падляцела і давай
Настырна расфуфырваць чары:
– Табе спяку я
смачны каравай,
прыпаднясу гарэлкі
моцнай чарку.
Ты будзеш на падушцы
мяккай спаць,
не на сухой, ігольчатай
кастрыцы.

Цябе я буду ночай цалаваць.
Мы можам нават
сёння пажаніцца.
І дзяцел здаўся,
прымаком пайшоў
да гэтай самай совушкі-савіцы.
Яна яго адзела ў новы шоўк,
пляла й пра залатыя небыліцы.
Ён кожны дзень
ахвотна піў і еў,
дапамагаў дзятве
рабіць урокі.
А цераз год ужо пераляцеў
да белабокай,
маладой сарокі.

*12.03.2023*



## *ПЕРАПАЛА*

Сініца слугавала ў вераб'я:
варыла стравы,
мыла ложкі, міскі,
давалася сябе
ў кутку абняць,
калі нікога не было паблізку.
А ён такі разбэшчаны
хадзіў,
зняважліва паглядваў
на суседзяў,
ні з кім сяброўства
ў вёсцы не вадзіў
і піва выпіваць
у горад ездзіў.
Раскашаваў гадоў так
пяць ці сем,
не ведаў ні турбот
ані, ні скрухі.
І дом яго быў,
як жывы эдэм,
дзе ён не атрымоўваў
аплявухі.

Але аднойчы на зыходзе дня,
калі сініцу ціскаў
ён на кухні,
заспела вераб'іха вераб'я
і гвазданула
чарпаком у вуха.
Любоўнік не паспеў
і рук разняць,
і не знайсці
для апраўдання словы –
пасыпалася пер'е з вераб'я,
як поўсць з худой,
ліняючай каровы.

*23.03.2023*



## *ДЗЕД І ПАЦУК*

Не знэнджаны пацук
шукаў яду ў хляве,
дзе не было
ні клеткі, ні карыта,
бо гаспадар той
жыўнасці не меў:
найбольш пасціў,
не харчаваўся сытна.
Было гаспадару
гадоў пад сто.
Ён дрэнна чуў
і слабавата бачыў,
не скошваў нават
крапівы густой
і планаваў свой дом
прадаць на дачу.
Ды гэты вось пацук
панадзіўся сюды:
падгрызваў сцены,
да нары быў скоры.
Напэўна, ён настырны,
малады,
бо ўжо далез
да бульбы ў каморы.

А ў дзеда тога
не было ката.
Тады стары купіў
у краме пастку.
“Не выкруцішся
ты ў мяне, брыда,
Закіну ў інвалідную каляску”.
Ён асцярожна
на кручок надзеў
скарынку хлеба,
кінуў крошку булкі.
“Няўжо на іх
грызун не нападзе –
на гэтыя прывабныя
пілюлькі?”
Наранку дзед
памкнуўся паглядзець,
што адбылося у яго каморы.
Прыйшлося аж прысесць,
атарапець:
ні пацука, ні пасткі –
толькі норы.

*24.03.2023*

## *КУНІЦА І САВА*

Куніца папярэдзіла саву:
– Не нападай на мышанят,
злaдзейка,
бо галаву сівую адарву,
заплача па табе ў бары
жалейка.
– Заткніся, рыжая, –
прамовіла сава. –
Ты з мной бездапаможная
цягацца.
Мне нават сам арол
наканаваў
нікога ў гэтым лесе
не баяцца.
Тут фыркнула сава
і паляцела ўніз
і мышку захапіла дзюбай –
тым самым праявіла
свой капрыз
перад куніцай вёрткай,
вострaзубай.
Куніца кінулася
на саву рыўком
і запусціла моцна
зубы ў спіну.

Сава ж яе па воку –
кіпцюром,
дваіх яны і ўпалі на ажыну.
Зноў бойку на зямлі
распачалі:
ляцела пер'е, кроў лілася.
Змагаліся, пакуль
не паляглі.
А мышка ўсё ж
жывою засталася.
Загінулі між хвояў і бяроз
куніца і сава без славы.
Так могуць скончыць
свой жыццёвы лёс
дзве ядзерныя звышдзяржавы.

*11.04.2023*



## *ПАДХАЛІМКА*

Ліслівіла ліса ваўку:
– Ты самы спрытны, самы смелы,
і не раўня зануду – барсуку,
які і палахлівы і няўмелы.
А воўк той, натапыраны
сядзеў
і скоса пазіраў на падхалімку.
Пасля паслаў яе ў фінаддзел,
які яна прызнала за малінку.
Воўк вельмі махінацыі цаніў
і зроду быў нячысты ён на лапу:
то пажывіцца задарма любіў,
то грошы з дзяржкішэні
хапаў.
Накапала ліса
мядзведзю на ваўка,
і той не стаў марудзіць,
ухіляцца,
а загадаў настырным вепрукам
да ісціны дарыцца, дакапацца.
Загад пад брылік
вепрукі ўзялі,
вышуквалі прыхаваныя факты,
стараліся, спяшылі, як маглі,
і акуратна састаўлялі акты.

Грахоў набралася
ў ваўка мяшок,
чым нават дбайных
следчых азадачыў.
І сцёр яго мядзведзь у парашок,
Ну а лісу начальнікам
назначыў.

*14.04.2023*



## *ДЫЯЛОГ ВОРАНА І КРАТА*

Так, крот сябе
                    не лічыць баявым,
жыве сабе ў сваёй
                    нары паціху.
Наесца чарвякоў, нібы халвы,
І сноўдае, каб
                    напаткаць краціху.
Ні кот не дабярэцца
                    да яго,
ні хітрая ліса
                    і ні сабака,
ні спёка, ні маланкавы агонь.
Ды вось што воран
                    з вышыні пракаркаў:
– Ну як ты там жывеш,
                    мышыны брат,
у цемрыве, без грама
                    кіслярода?
І ўсё капаешся
                    кудысьці наўгад…
Цьфу на цябе,
                    крацiная парода!
А тут такая прыгажосць
                    наўкол,
шумяць лясы,
                    квітнеюць сенажаці,
сінее неба, зелянее дол –

не варта табе
гэтага цурацца.
Адлюднік ты,
сівы, нікчэмны крот.
Баішся на паверхню
нос паказваць?
Сядзіш там пад зямлёю
з году ў год.
Якая можа быць
у гэтым радасць?
– Затое, воран,
тут мяне нішто
не пакалечыць,
не заб'е знянацку.
Я не адзін,
тут полчышчы кратоў,
і ўсе жывем
спакойна і па-брацку.
Ну а ў цябе
ці ўрэжацца снарад,
ці новы вірус грыпа
ці халеры.
Не, я табе
не пазайздрошчу, брат.
Такія вось
няважныя паперы…

*15.04.2023*

## *ДАЧНІК І КАЛАРАДСКІ ЖУК*

Зняў з бульбы каларадскага жука
несамавіты, прастадушны дачнік:
– Ты як сюды,
у край наш, завітаў,
пагані, надаедлівы праказнік?
– Мяне са штата
Каларада прывязлі,
з лабараторыі,
як штучную заразу, –
і распаўзліся мы па ўсёй зямлі,
і бульбу есці
пачалі адразу.
– Чаму ж вас
не нацэлілі ў ЗША
на крапіву, асот
альбо макрыцу?
У іх праграмы
розныя кішаць…
– Наіўны дачнік,
не пляці дурніцу.
Ім абы шкоду
людзям прычыніць,
а іншых клопатаў
яны не знаюць.

За іх спіной
вялікія чыны,
якія паўпланеты аграбляюць.
– Выходзіць, вы
бязвінныя, жукі?
Паслушныя рабы – не болей?
– Мы адурманеныя прастакі
і дзейнічаем
не па ўласнай волі.
Мы зомбі, дачнік.
Ведай і маўчы,
бо зараз і на вас
нашлюць навалу.
У іх да ўсіх мікробаў
ёсць ключы.
А я? Хто я?
Мне абы грам крухмалу.

*27.04.2023*



## *КАРШУН-ЛІХАДЗЕЙ*

Не вабны, закажэнены каршун
парыў у небе
і шукаў наедак.
Яго не зачароўваў
лесу шум
і прыгажосць бярозавых сукенак.
Ён, крыважэрны,
як Нерон-паэт,
і падае ўніз на птушак смела,
і столькі ўчыніў
за век свой бед,
што падлічыць
зязюля не сумела б.
А малады, неасцярожны дрозд
аблюбаваў чырвоную каліну –
і кінуўся туды
каршун наўпрост,
ды ўрэзаўся ў калючую галіну.
Кроў пацякла
з разбітай галавы.
Ляжыць драпежнік,
лыпае вачыма,
такі бездапаможны
і сівы…

– Вось тут табе
                    і будзе, гад, канчына, –
сказаў павесялелы дрозд
і выпрастаўся на ўвесь рост.
Не убірайцеся ў пер'е каршуна,
бо можа напаткаць,
                              як і яго, хана.

*30.04.2023*



## *ЛЬВЫ І БУЙВАЛЫ*

Паганец-леў
на буйвала напаў,
хацеў спатоліць голад
масай мяса.
Ды той яго
паставіў на-папа
і галаву драпежніку
расквасіў.
Падбіты леў
знядужана зароў,
суродзічаў паклікаў
ён, нягеглы, –
і тыя закрычалі:
“Кроў за кроў!”
І на падмогу
беднаму прыбеглі.
Прыбеглі, як фанаты
на футбол,
не пазычаючы
звярынай хваткі,
і павалілі буйвала
на дол,
і рвалі яго тушу
на кавалкі.

А статак буйвалаў
стаяў, маўчаў,
не кінуўся
на паратунак брата,
драпежнікаў калечыць
не пачаў, –
шукай цяпер,
хто ў смерці вінаваты.

*07.11.2023*



## *КАРАЕД*

Някідкі, непрыгожы караед
на тоўстай хвоі
распачаў абед.
Ды тут аднекуль
дзяцел прыляцеў
і задзяўбці нягодніка хацеў.
– Панок, – заплакаў караед, –
не еш мяне, я даўні
твой сусед.
Ты лепш – на мыш
унізе нападзі,
яна тлусцейшая,
чым я. Глядзі!
– Ты не задурвай мне,
падонак, галавы.
Мыш – страва вунь
для той савы.
А ты – наедак добры
для мяне.
Ты ведаеш, за што
цябе народ кляне?
За тое, што кару
ціхмя грызеш,
і з-за цябе хварэе,
сохне лес.

– Панок, – мацней
узмаліўся караед, –
то ж, радыяцыя
прынесла процьму бед,
і дрэвы засыхаюць ад яе.
А я кары аніякой
не ем.
– Хітруеш, братка, –
дзяцел тон прыўзняў
і караеда дзюбай
прыпадняў. –
Вось зараз праглыкну
за твой падман
і змоўкнеш,
як прырэзаны баран.
– Вялікасць Ваша, –
мовіў караед, –
я хворы пандэміяй,
я амаль шкілет.
І скула ў мяне
гнаіцца на гарбе,
баюся заразіць, паночак,
і цябе.
– Цьфу, ты паршывец, –
дзяцел аж збялеў
і караеда выплюнуў
на мурашыны хлеў.

І там мурашкі
з'елі хітраца.
Так і дадыбаў ён
да горкага канца.

---

Да ўсякіх шкоднікаў
прыходзіць пакаранне,
не гледзячы ні на пасаду,
ні на званне.

*26.11.2023*



## *КАМАР-ПАКЛЁПНІК*

Камар паклёп
наводзіў на пчалу,
што злосная яна
і колецца іголкай,
на твар вам можа
пасадзіць скулу
і ўкусіць прахожага
праз порткі.
Мёд хоць збірае,
дык сама і есць,
а пчаляру дае
адны аб'едкі.
І муж яе, і мужаў
тлусты цесць
зачаста прыпадаюць
да гарэлкі.
Пчала не папракае іх,
маўчыць.
Яшчэ і мёд прыносіць
на закуску
і ад кладоўкі
аддае ключы
за паўкілішка згары
ці за буську.

Дачуўся пра паклёп
пчаліны муж
і камара наводмаш
моцна ўдарыў:
– Ты што наводзіш
плёткі, чортаў вуж?!
Я і не нюхаю
ні піва і ні згары.
– Я? Я не я, – заёрзаўся
камар. –
Мо гэта чмель
ці божая кароўка…
Ды тут жа атрымаў
другі ўдар –
і стаў паклёпнік
месцам мокрым.

---

Калі ў цябе
завузкаваты лоб
і сам ты
закажэнены і вялы,
дык не наводзь
ад зайздрасці паклёп
на чэсных, працавітых
і ўдалых.

*02.12.2023*

## *ЧАЛАВЕК І МАЛПА*

У Афрыцы пад пальмаю
сядзеў
прыезджы з Беларусі
нехта Цішка.
Ён нешта ў адзіночку
піў і еў,
і да яго прыдыбала
мартышка.
– Ты наш патомак, –
мовіла яна. –
Праз працу спрыту,
розуму набраўся
і прыахвоціўся
патроху да віна,
і спакваля да Месяца
дабраўся.
– Ну некалі Чарльз Дарвін
так казаў:
што чалавек пайшоў
усё ж ад малпы,
а ад каровы
і быка каза,
а дуб нібыта
ад прыгожай пальмы.
Ды я не веру
гэтаму ані.

І ты падстаў
і доказаў не маеш.
Цябе вось тут
хоць качаргой забі –
ды чалавекам
ўсё-такі не станеш.
Не, ты не маеш
рацыі, мартышка.
І не працягвай
лапу да кілішка.

*02.12.2023*



## *ПРЫМАК*

Казёл пайшоў упрочкі
да казы.
Яна яму спачатку
дагаджала:
і дапускала да свае казны,
і ўволю есць і спаць
давала.
Пасля патроху
пачала бурчаць,
што ён занадта
многа курыць,
пры людзях пачынае
моцна чхаць,
што аж палохаюцца
куры.
Сабаку злоснага
аднекуль прывалок,
які ўсю ноч
на месяц вые.
І сам, бы круглы
абібок,
ёй ні спадніцаў,
ні панчох не мые.
Разгневаўся абураны
прымак
і зноў вярнуўся
ў сваю хаціну,

садзіў цыбулю,
украдкай сеяў мак,
трымаў курэй,
рагатую скаціну.
А ў казы ўсё
пайшло не так:
ні дроў няма каму калоць,
ні рэзаць сечку,
ні на кавалкі
раздбрабніць бурак,
ні ад свіней
адгарадзіць авечку.
Прыйшла каза
да прымака сама:
– Вяртайся, галубок,
у мой закутак.
Я буду смажыць
акуня, сама
і ваксаваць твой
кірзавы абутак.
Але казёл той
ганарлівы быў
і забляяў надрывіста
і строга:
– Рабы, нахабніца, не мы,
мы не рабы.
Шуруй, пакуль я добры,
ад парога.
*08.12.2023*

## *ВАЯЎНІЧЫ ХРУШЧ*

Хрушч неяк з клёна
папракнуў жука:
– Чаго ты капашышся
ў конскім гноі?
Такога ад цябе я не чакаў…
Я думаў: ты
сапраўдны воін.
Цябе ў атаку,
пэўна, не падняць…
Туляешся
ў ацпленых акопах,
а каларадскія жукі
даўно сядзяць
на бульбе міліённым
скопам.
Ты мог бы іх
усіх перадушыць
і вызваліў бы
бульбу ад навалы.
Не разумею, як так
можна жыць
паблізу
ад няўзброенай аблавы.

Я дык лятаю,
як навейшы дрон,
і тых, хто ўнізе,
болей не баюся.
Я маршал Жукаў,
я Напалеон!
Ля сённяшніх герояў
бокам труся.
– Ну й разышоўся ты,
таварыш хрушч.
Да палкаводцаў
трэба быць спаважным.
Запудраныя вочы
больш расплюшч.
Недастаткова ў бітвах
быць адважным.
Так, смеласці ў цябе –
хоць адбаўляй,
а розуму – я не скажу,
што процьма.
Ты там на клёне
дурня не валяй,
а лепей да майго
туліся локця.

– Не, Жук Жуковіч,
ты хоць мой сваяк,
ды не магу я
цешыцца табою,
бо я прывык
да штурмаў і атак,
а ты ў нару
хаваешся ад бою.
– А … Кожнаму сваё, –
прамовіў жук. –
Я буду чым далей
ад ўсякай бойні,
а ты як самы
ваяўнічы зух
змагайся з машкарой
на гэтым клёне.

*09.12.2023*



## *МАХЛЯРКА*

Варона каркала
на дрэве пра бяду,
як быццам хто яе
сціскаў за горла.
А голуб варкаваў
ля лаўкі на хаду,
казаў, што ўсё ў нас
пойдзе вельмі добра.
Яго любілі ў двары ўсе:
хто кіне крошак,
хто пшана насыпле.
Ён падрастаў,
мажнеў тут пакрысе
і быў удзячны людзям
за гасціннасць.
Сцвярджаў, што на Зямлі
наступіць мір,
і будзем жыць па светлых
Божых планах,
не ўздрыгнуць
ні Карпаты, ні Памір,
і на душы ў народаў
стане файна.
А гэтая адлюдніца ўгары
бясконца каркала
пра войны і пажары.

Казала: свет наш
у агні згарыць
альбо загіне
ад атрутнай згары.
Варону праганялі
мы з двара.
“Акыш! – крычалі . –
Вон адсюль, пляткарка!
Табе здыхаць
даўно ўжо пара,
а ты ўсё не сціхаеш
гэтак каркаць.”
Ну, а яна ўсё пра сваё
ды пра сваё,
нібы не можа
жыць без ашуканства:
“Вам не пазбегнуць
стратаў і баёў,
канфліктаў, землятрусаў,
хуліганства.”
“Не, ты дурная! –
крыкнуў галубок. –
Не блытайся падманліва
ў прагнозах,
Бо нехта скруціць
галаву набок –
і не заплача па табе
твая бяроза.”

Варона ўздрыгнула
і паляцела прэч,
А галубок застаўся
каля лаўкі.
Лепш пазбягаць
з пляткаркамі сустрэч
і не ўспрымаць,
што каркаюць махляркі.

*10.12.2023*



## *ГІСТОРЫЯ З ШАШКОМ*

У дзядзькі прозвішча
было Шашок,
і да яго ў двор
панадзіўся шашок.
Найбольш ён
нападаў на куранят.
Ой, спрытны ж быў
і хітры гэты гад.
Задушыць куранё
і валачэ за хлеў,
дзе ён пад жэрдкамі
сваю кватэру меў.
А дзядзька не лічыў
тых куранят.
Агледзеўся, калі
іх стала ўжо няшмат.
Спярша падумаў ён
пра каршуна,
ды не была даказана
яго віна.
Стаіўшыся Шашок
стаў пад хлявом,
каб абязвечыць
злодзея калом.

Ды той быў з розумам –
не пень, не пень:
з-пад жэрдкаў не вылазіў
цэлы дзень.
Ход пад падмуркам
пракапаў шашок
і ноччу прабіраўся
ў хлявушок.
Ды неяк певень
на яго напаў,
задзёўбаў,
уцячы назад не даў.
Наранку дзядзька
дзверцы адчыніў –
ляжыць шашок,
навек ён тут спачыў.

---

Хоць красць чужое
часам удаецца,
на нечым злодзей
ўсё-ткі пападзецца.

*12.12.2023*

## *ТАРАКАН*

На кухні па пасудзе
поўзаў таракан,
шукаў чаго паесць –
залез у збан.
Ды не знайшоў
і кроплі малака
і стаў адтуль
паспешліва ўцякаць.
Бабулька сцапала
знянацку паўзуна,
шпурнула праз вакно:
“Прэч, сатана!”
А на двары, хоць
і трашчаў мароз,
не разгубіўся ён
і не замёрз,
назад, на кухню,
борздзенька прыпоўз.
Будзь сказана бабулі
не ў дакор,
зноў выкінула
паўзуна на двор.

Там верабей яго
і праглынуў,
і на галінцы
радасна ўздыхнуў.
Занадта быў
настырны таракан,
насіў у галаве ён
агрэсіўны план…

*14.12.2023*



## *БАРАВІК І МУХАМОР*

У лесе мухамор
і баравік раслі
і між сабою спрэчкі
завялі.
– Ды я, ды мы! –
выкрыкваў мухамор. –
Мяне шануе й
паважае бор.
А на цябе й
асіна не глядзіць.
Ты не ўмееш
людзям дагадзіць.
Я ростам вымахаў –
глядзі які!
А ты плюгавы нейкі
і брыдкі.
І шапка ў кропачкі
прыгожая на мне.
Жыву я ў роскашы,
купаюся ў віне.
А ты на лоб
напяліў капялюш,
не бачыш, як паўзе
паблізу вуж.

Ды і нага ў цябе,
як не нага,
а нейкая рабая булава.
Мяне не абмінаюць
вепрукі,
і песні пра мяне
пяюць гракі.
– А можа каркаюць, –
заўважыў баравік
і перайшоў ужо
амаль на крык. –
Ты каркання дастойны –
і не больш,
найболей здатны
трапіць пад галош.
Ды што ты акалесіцу
тут прэш?!
Атруту ты
ў сабе нясеш.
Цябе футболяць
у лесе грыбнікі,
ласі, казулі, вепрукі.
Паганец ты,
зануда-мухамор,
пра гэта нам пяе
сасновы хор.

Нікчэмнасць ты,
смярдзючы мухамор.
Так, ад цябе ўпадаюць
мухі ў мор.
Мне сорамна з табой
вось тут стаяць,
яшчэ й пра нешта
ўголас размаўляць.
Абходзьце мухамора
лепш здаля:
ён не каштуе
дохлага нуля.

---

Мо й між людзей
дзе мухаморы ёсць,
якія ў свядомасці,
бы ў горле косць.

*16.12.2023*

## *КАРАСЬ*

Мацёры, пазалочаны карась
зашыўся каля берага
ў гразь.
Над ім насілася
гуллівая плотва,
прастрэльвалі
вадзіцу шчупакі.
І ўбачыла
паўсонная Дзітва:
ідуць сюды
з аглядкай рыбакі.
– Тут некалі,
я помню, быў кар'ер, –
прамовіў барадаты
браканьер. –
Яго злучылі
трактары з ракой,
і рыбы тут –
хоць ты хапай рукой.
Давай закінем невад,
можа, тут
і рыбу возьмем
у сплашны хамут.

– Я згодзен, – адказаў
другі рыбак, –
а як яго закінуць?
– А вот так:
на беразе расцягнем
невад нахаду
і кінем грузікамі ў ваду.
Так і зрабілі.
І за вераўкі
свой невад выцягнулі
рыбакі з ракі.
Было ў ім многа
плоткаў, шчупакоў.
Ды рыбнагляд набег
з усіх бакоў.
Аштрафавалі рыбакоў,
забралі снасць…
… На іх данёс
па рацыі карась…

*08.01.2024*

## *ПАРАДЫ*

Дабралася да шапкі
з норкі моль –
і дзядзька (не Германскі
канцлер) Коль
не ведаў, як і што
тут з ёй рабіць,
і стаў парады
ў людзей прасіць.
Вінцук сказаў:
– Насып на поўсць
паўжмені тытуню.
Яна яго баіцца,
як агню.
Коль пенсіі
не шкадаваў
і цыгарэтаў
многа накупляў.
Расцёр іх і тытунь
на поўсць паклаў:
– Тут будзе, моль,
табе другі анклаў.
Ды моль не здохла –
стала яе больш,
і нават завялася
ў поўсці вош.

Фадзей параіў:
– Дзядзька Коль,
пасып па шапцы
густа-густа соль.
Праз тыдзень паздыхае
моль твая –
і шапка стане
зноў, як новая.
Засыпаў шапку соллю
дзядзька Коль –
і, праўда, паздыхала
тая моль.
Але чаго заплакаў
бедны Коль?
Раз'ела поўсць
і нават шкуру соль.

*09.01.2024*



# *ВОЎК-ПРАДПРЫМАЛЬНІК*

Адкрыў буфет у лесе
шэры воўк,
навешаў шарыкаў
на дзверы і акно,
каб павялічваўся
звяроў прыток,
пілі гарэлку,
каньячок, віно.
Пераступіў парог
найпершым рысь:
– Па чым сто грамаў?
– Я прашу пятак.
– А ёсць хоць чым
гарачанькім загрызць?
– Ёсць піражкі,
падсмажаны шчупак.
Пашарыў па кішэнях
хітры рысь –
а там пустэча:
– Грошыкаў няма.
– А ну адсюль хутчэй,
галота, брызь!
Не дам табе я
выпіць задарма.

Рысь выскачыў
і плюнуў на сцяну,
і зноў палез
на тоўстую сасну.
Наступным ўвайшоў
вялікі лось,
павёў вачыма
пільнымі наўскось:
– Па чым каньяк
вунь той “Напалеон”?
– Па сто рублёў каштуе
сёння ён.
Лось ад здзіўлення
гучна так зароў,
што ў ваўка
ажно застыла кроў.
Сахаты развярнуўся,
выйшаў вон:
– Гарыць ён гарам
твой “Напалеон”!
Праз паўгадзіны
завітаў мядзведзь:
– Чым тут нутро
мне з холаду пагрэць?
– Ёсць “Першачок”,
“Бульбаш” ну і “Сваяк”,
ёсць адмысловы,
шасцізоркавы каньяк.

– Налі чатыры шклянкі
"Бульбаша",
але пра мой візіт
у лесе ні ша-ша,
і сам за дружбу
трошкі хлебані,
аднак пра мой візіт
нікому а ні-ні.
Пілі мядзведзь з ваўком
пакуль маглі…
Пасля раптоўна
біцца пачалі.
Мядзведзь ваўка
за хвост да бэлькі прывязаў,
а сам яго буфет
абрабаваў.
Прыйшла ваўчыха:
– Ты чаго вісіш,
як Мусаліні, галавою ўніз?
– Валтузіўся з мядзведзем
доўга я,
і ён мяне
да столі прыпадняў,
а сам буфет
дачыста абакраў.
– Казала, шый з авечых
шкураў кажушкі,
а ты ўсё марыў
пра грашовыя мяшкі…

Ты сам з мядзведзем.
бачу, налізаўся…
Як дурнем быў,
так дурнем і застаўся.
Ваўчыха перарэзала вяроўку
й воўк
упаў, пабіўшы,
аб падлогу бок.

*17.01.2024*



## *НУПРЭЙ І КУРЫ*

Знаёмы дзядзька
Ціт Нупрэй
завёў на дачы
сем курэй.
І вось аднойчы
бліз гнязда
засакатала
курыца адна:
– Ко-ко-ко,
ко-ко-ко!
Ціт, не крадзі
маё яйко.
Не гожа так,
спадар Нупрэй:
ты губіш
будучых курэй.
Ну а Нупрэй
бы ў сон урос,
узяў яйко
і ў дом панёс.
Чубаткі змову
ўраз сплялі
і на ўчастку
падзяўблі

пятрушку, тыквы,
агуркі,
капусту, моркву,
буракі.
Стаіць Нупрэй,
як сам не свой,
рашае даць
чубаткам бой.
Прынёс сякеру,
бервяно:
– Я пасяку ўсіх
да адной!
Ды тут аклікнуўся
сусед:
– Ціт, не чыні
чубаткам бед.
Лепш плотам
іх абгарадзі
і ўдзень яёк больш
не крадзі,
а як пачнуць
чубаткі спаць –
ты яйкі можаш
выбіраць.
Маруднасць –
людзям не сястра,

ганіце вон яе
з двара:
пакуль узводзіў
плот Нупрэй –
ліса пакрала
ўсіх курэй.

*18.01.2024*



## *БУРНОС І ТЭЛЕВІЗАР*

Аднойчы незадумлівы
Бурнос
дадому новы
тэлевік прынёс.
Сядзіць у мяккім крэсле,
нібы пан,
і цэлы дзень глядзіць
ён на экран.
Абрыдла тэлевізару
трываць –
і ён пачаў
Бурноса папракаць:
– Ну што ты пяліш
зрэнкі на экран,
як на вароты
новыя баран.
Ты ж бачыш,
я кручу біліберду:
як есць даюць
сабаку ці кату,
як смажаць рыбу,
блінчыкі пякуць,
як дровы сукаватыя
сякуць.
Няўжо табе
такое па душы?

Ці без мяне
ўжо не ў стане жыць?
Мо даў бы мне
хоць трошкі адпачыць?
Прашу цябе, шаноўны,
адключы.
Бурнос прыкінуўся,
што спіць,
прыжмурыў вочы
і маўчыць.
Пасля як схамянецца,
закрычыць:
– От, не дуры мне
галавы, экран!
Я сам сабе і парабак,
і пан,
і што хачу,
дык тое і раблю.
А будзеш балбатаць –
другі куплю,
на кухне прымацую
да сцяны,
што не пакажа ён –
мне хоць бы хны.
– Ну ты й "усяядны"
тып, Бурнос.
Табе хоць жабу
пакладзі пад нос.

*20.01.2024*

## *НА МАРСЕ*

Дрозд неяк ранкам
заляцеў на Марс.
Яго сустрэў
змагар за шчасце Маркс:
– Ты тут не выжывеш,
малюсенькі драздок.
– От, не хвалюйся
за мяне, панок,
і “Маніфестаў”
болей не пішы,
бо зараз людзі
ў іншы бок пайшлі.
– А-а! На Зямлі ўжо,
мусіць, люд такі,
шарахаецца
ў розныя бакі:
то робіць для
рыбалкі паплаўкі,
то вострыць кулі,
шаблі і штыкі.
– У нас драздоў,
таксама сумятня:
то ліжамся,
то сварымся штодня,

то са шпакамі
б'емся за яду,
то ўпадаем
у нейкую нуду.
А зараз між людзьмі
сплашны
разброд…
Я згодзен: на Зямлі
такі народ.
– Дык што, не паляцім
мо да Зямлі,
а тут утворым
рэкі і палі
і станем ціха,
адмыслова жыць,
з Венерай і Юпіцерам
дружыць?
– Давай застанемся,
дзядуля, тут,
бо хутка прыйдзе
той Зямлі капут.

*22.01.2024*

# *ЯНОТ*

Янот пачаў
на хутар заглядаць
і ад курэй яду
стаў адбіраць.
А куры
палахлівыя былі,
уцякалі ў падпаветку,
як маглі.
На хутары жылі
сабака й кот.
Але сабака быў –
адпеты абармот:
па большай часці
ў будзе спаў і спаў,
нікога не кусаў
і не чапаў.
А кот на прызьбе
цэлы дзень драмаў
і на янота
ўвагі не звяртаў.
Ну, а ў бабулі
свой занятак быў:
хадзіла ў лес
далёкі па грыбы.

І некалі схуднелы
смоўж – янот
адгадаваў
на хутары жывот.
І неўзабаве, ўжо
прыйшла пара, –
ніяк не можа
выбрацца з двара.
Затоўсты стаў –
не прашмыгнуць праз плот.
Так і застаўся жыць
на хутары янот.

*05.02.2024*



## *КОТ-ЗОМБІ*

Сівенькі дзед ў вёсцы
жыў з катом,
дзяліліся яны
сырком і малаком,
хадзілі разам
у каморку і ў хлеў,
дзе кот лавіць мышэй
выдатна ўмеў.
Да іх дваіх не лезла
ў твар бяда.
Сябрамі сталі –
не разлі вада.
Ды ўбачыў неяк
у каморцы дзед:
грызуць мышакі
бульбу ў абед.
Нікольkі не баяцца
ўжо ката,
нібыта ён ім –
родненькі братан.
Пасля яны
гулялі ў чахарду,
скакалі ўжо
на галаву кату.

Глядзіць ў поўным
недаўменні дзед:
хто тут наладзіў
ім кардыбалет?
– Баюн! – аклікнуў ён
ката. –
Скажы мне праўду:
што за ерунда?
Чаму не нападаеш
на мышэй?
Ці ты не бачыш іх?
Ці слых уцёк з вушэй?
– Я зомбі, дзед,
і не магу хоць што зрабіць,
каб гэтых грызуноў
пералавіць.
– А хто ж цябе
паспеў зачараваць?
– Ды пацукі,
калі ты ўлёгся спаць.
І я цяпер
пад дудку іх скачу,
дзе трэба мяўкаць,
я, дзядок, маўчу…

*07.02.2024*

## *КАРШУН І КРУМКАЧ*

Каршун хваліўся
ранкам крумкачу:
– Я заўтра ў космас,
братка, палячу.
Давай мо разам
здзейснім свой палёт,
пабудзем на якой планеце
хоць бы з год.
– Я згодзен,
даражэнькі каршунок,
ды ці дапусцяць нас
на касмадром “Восток”.
– Я з буслам
пазаўчора размаўляў –
і ён дазвол на ўзлёт
адразу даў.
І вось на старт
ракету прывязлі,
і адарвалася яна
ўдачна ад Зямлі.
Ляцелі больш,
як пяцьдзесят гадоў.
(Хапала ўсякіх
у ракеце ўмоў).
І на планету
трапілі адну,
дзе нават і не чулі
пра вайну.

Сустрэў іх
барадаты велікан
і мовіў, бы ў вялікі,
звонкі збан:
– Крумкач няхай
пабудзе трошкі тут.
Ну а цябе, каршун,
мы аддадзім пад суд
за тое, што
на птушак нападаў,
што рацыён твой быў
з крывавых страў.
Суддзя быў строгі
(як і на Зямлі) –
і каршуну пяцьсот
гадоў далі.
Ну а крумкач вярнуўся
ўжо дамоў
і марыць паляцець
у космас зноў,
бо з той планеты
золата прывёз
больш, чым праліта
за ўсе войны слёз.
А каршуну сядзець там
ды сядзець
і кайданамі цяжкімі
грымець.

*07.02.2024*

## *ВАСЬМІНОГ І КІТ*

Нікога не баяцца –
даў сабе зарок
каржакаваты,
пакручасты васьміног.
Малюсенькія рыбкі
праплывалі збоч –
іх не хапаў падводны
гэты корч.
Стаіўшыся ўгору
пазіраў,
больш буйную
ахвяру падбіраў.
Тут у яго быў
бліз каралаў дзот,
і кіт сюды падплыў –
пудоў пяцьсот.
Агрэсар кінуўся
праз тоўшчу вод
і шчупальцамі абхапіў
плаўца жывот.
– Не на таго напаў,
паўзучы корч,
тут зараз для цябе
наступіць ноч.

Кіт тушаю яго,
прыціснуў да зямлі –
і з васьмінога
атрымаўся плоскі блін.

---

Перш, чым знянацку
на кагосьці нападаць,
патрэбна свае сілы
вымяраць.

*12.02.2024*



## *ЁРШ І КАЛЮЧКА*

Калючы, смелы
і касцісты ёрш
сказаў калючцы:
– Мы жывём не з горш.
Нас не хапаюць
акуні і шчупакі
і  адпускаюць,
калі зловяць, рыбакі.
Аднойчы, праўда,
немалы шчупак
мяне схапіў і праглынуць
хацеў няўзнак.
Я ж выпрастаў
калючкі на спіне
і моцна закрычаў:
“Не праглынеш!..”
І, праўда, той
спалохаўся шчупак –
і адпусціў мяне
з дабром стары лайдак.
– Нас выратоўваюць іголкі,
братка ёрш.
Без іх прапалі б мы
ані за грош.

Ну і наедак з нас
зусім слабы,
пра гэта нават
ведаюць бабры.
– Давай пажэнімся, –
прапанаваў ёй ёрш, –
мо будзе сын у нас
такі мажны, як морж.
– Давай! – узрадавана
мовіла яна.
І весяліліся з відна
і да цямна.

---

Як зловіце
худога малыша,
дык ведайце, што гэта
сын калючкі і ярша,
і адпусціце зноў
яго ў раку,
каб пагражаў
і акуню, і шчупаку.

*21.02.2024*

## *ГРАК І РАК*

– Ну, як жывеш ты,
паважаны рак? –
спытаў з алешыны
цікаўны грак.
– От, варушуся ў вадзе
сяк-так,
як той на хутары
стары дзівак.
Я ўжо на пенсіі
даўно сяджу
і часта знізу
на цябе гляджу.
Табе зайдрошчу я,
шаноўны грак:
ты воблакам
і дрэвам як сваяк.
А я сяджу тут
ціха пад карчом
і з шыцікаў рыхтую
суп “харчо”.
– Ці чуў, што
ва Ўкраіне йдзе вайна?
Мо ведаеш, калі
закончыцца яна?
– Чуць-чуў, але канца
ёй не магу ўгадаць …

Табе ж з-пад неба
можа лепш відаць?
Ты лётаеш туды-сюды,
як дрон.
А у мяне ў вушах
ад ціску звон,
і зрок сягае
толькі да цябе
і да вароны той,
што на вярбе.
Так што, як прыйдзе
той вайне канец,
паведамі мне,
чорненькі мудрэц.
– А ў цябе мабільнік
ёсць там, пад вадой?
– А як жа, я нашу яго
заўжды з сабой.
Грак каркнуў
і ўзяў кірунак на Херсон.
Яго там збілі:
прынялі за дрон.

*22.02.2024*

## *ВЕРАБЕЙ-ПАЛІТЫКАН*

– Ты пра палітыку
мне байку не мялі,
лепш слухай,
як курлычуць жураўлі, –
заўважыў бусел
строга вераб'ю,
бо зараз я цябе
як смельчака паб'ю.
– Ды што ты, дзядзька,
я не палітыкан,
не разбіраюся, дзе праўда,
дзе падман.
Мне б толькі надзяўбціся
ўсмак зярнят,
ды выгадаваць
здатных птушанят.
Табе ж і жураўлям
усё карціць
убачыць, дзе паводка,
дзе тайга гарыць.
Вы ўздымаецеся ўгору
назнарок,
а я з галінкі
на галінку – скок.

І добра мне і хораша
так жыць.
Навошта мне палітыка?
Скажы.
Я блізарукі,
як паўсонны кот,
ці як ў вёсцы кажуць
ботам бот.
– Хітруеш,
вёрткакрылы верабей.
Ты й не такі
зацюканы плебей…
– Патрыцый, чэсна
праўду я кажу,
што толькі гэтым вось
гняздом і даражу.
Бацян узняўся,
паляцеў на лес,
а верабей ізноў
у палітыку палез:
крытыкаваў варон,
як толькі мог,
і камароў, і крапіву,
і мох.

*29.02.2024*

## *ЯЎХІМ, САБАКА І БЛОХІ*

Яўхім бадзячага
сабаку прыручыў
і на канапе спаць
яму дазволіў –
і той багата
блохаў напусціў,
якія далучыліся
да молі.
Яўхім любіў славуты
лідскі квас:
пры Жэўжыку хлябаў
яго без меры –
і блохі перакінуліся
ўраз
на памяркоўнага
гаспадара кватэры.
Калі Яўхім піхаў
скарынку ў рот
і нешта смачнае
трымаў у жмені,
яны на карк скакалі
й на жывот,
і на худыя
вострыя калені.
Перадушыць іх
гаспадар не мог:
яны хаваліся ў адзенне,
пад канапу –

і развялося гэтых
самых блох
больш, чым смярдзючай
поўсці на сабаку.
А ноччу пад дзвярыма
лаз знайшлі,
прабраліся на лесвіцу
адважна
і, бы паротна
ў наступленне шлі,
кідаліся на сціплых
і на важных.
Такімі хутка-спрытнымі
былі,
што казыталі ўжо
дзяўчатам пяты,
і неўзабаве
даскакаць змаглі
ад першага паверха
аж на пяты.
Сусед Яўхіму
выказаў папрок:
– Чаму ты дыхлавосам
блох не морыш?
Яны ўжо мне на рукі –
скок ды скок…
– От, не пляткар,
Захар, у калідоры.

*14.03.2024*

## *ЛЕШЧ І КЛЕШЧ*

Паганы крывапійца-клешч
глядзеў, як плавае
прыгожа лешч,
і, вусы растапырыўшы,
спытаў:
– Што ты ясі,
рачная беднага?
– Усё запар.
Не галадаю я.
– А я дык упіваюся
ў каня,
у чалавека,
соннага лася,
у тлустую свінню
і парася.
Ты п'еш вадзіцу там,
на дне ракі,
а я чужую кроў.
Я, ляшчучок, такі.
– Знайшоў хваліцца чым…
Ты паразіт!
Ты людзям і жывёлам
так абрыд,
што кожны рад цябе
пераўтварыць у прах

на сенажаці, у лесе,
у дварах.
– Мяне не проста,
ляшчучок, злавіць:
я навучыўся
непрыкметна жыць.
Я поўзаю пад лісцем,
пад травой.
Як той казаў,
я хлопец з галавой.
Ды бег аднекуль
гонкі конь-скакун
і скінуў капытом
кляшча ў раку.
А лешч шукаў яду,
плыў наташчак –
і тут жа ўхапіў
упаўшага кляшча.

*22.03.2024*

## *СЦЯПАН І БАЯН*

Не малады,
дапытлівы Сцяпан
купіў стары,
падношаны баян.
На ім пачаў вучыцца
ён іграць
і пальцамі стаў
гузікі кранаць.
Але мелодыю не знаў,
як падабраць.
На гузікі
націсне наўгад,
а ў баяне тым
сплашны разлад.
– Ды што ты, Сцёпа, –
зарыпеў баян, –
не ўводзь сябе
ды і мяне ў зман,
бо слуха ў цябе зусім няма –
такога я
і не прысніў дзярма.
А Сцёпа гне
па-грубаму сваё:
– Няўжо такі я
невук, ё-маё?

А можа ты няўмека,
хлус-баян?
Ты хоць бляі,
як той рагач-баран.
А то:
то па-дурному зарыпіш,
то засапеш,
альбо зусім маўчыш…
З цябе не выціснеш
мелодыі ніяк,
ты як разбіты
на кавалкі гляк.
Ну як такіх
сварлівых прымірыць,
калі ўнутры ў іх
усё хрыпіць?

*07.04.2024*



## *ВЕРАБЕЙ*

… А верабей
у палітыку не лез,
не рэзкі быў
на думкі і на словы.
Яго палохаў
партызанскі лес,
незразумелы дух
перабудовы.
Ён капашыўся
ў скошанай траве
і адчуваў сябе ў гняздзе,
як дома.
І што ў яго было
ў галаве –
ні вам, ні мне
нічога не вядома.
Зімой пад крокваю
туляўся ён,
саломай саграваў
худую спінку.
Калі ж хто ў хаце
свежы еў булён –
ад паху ён глыкаў,
галодны, слінку.

Быў сціплы, як адлюднік,
верабей.
З сініцамі за ежу
не сварыўся,
і думку затаіў
на ўсё жыццё ў сабе:
на спіны не сядаць
ні вепрука, ні рыся.
Круціўся між кабылаў,
жарабят,
у траваядных
заваёўваў славу.
Каршун  падпільнаваў
тут вераб'я,
панёс яго ў пушчу
на расправу.

*22.11.2024*

## *КРАПІВА І АСОТ*

Зласловіць крапіва
пад плотам,
што ёй так цесна,
б'юць яе,
што ёй
з напарнікам-асотам
прасторы надта не стае.
Ідзе нахабна
ў наступленне
на моркву, рэдзьку,
буракі,
і з пакалення
ў пакаленне
свае ўтварае астраўкі.
Ну і асот
услед за ёю
не спіць, а лезе
напралом.
Яны павязаны
гульбою,
пякучым і калючым злом.
І ў грамадстве
так бывае,
і ў ім не выраўняць
мяжы,
дзе шпарка погань
наступае
і не дае сумленна жыць.

*13.01.2025*

## *ЗМЕСТ*


Рыбак і калючка .....................................4
Вепр, асёл і слон ...................................6
Агрэсарка ...........................................8
Адмова ..............................................9
Вайна ..............................................10
Дзве думкі .........................................11
Драпежны шчупак ....................................12
Дыялог труса і зайца ...............................13
Крадзёж ............................................14
Ластаўка і каршун ..................................15
Мурашка і камар ....................................16
Пусты сон ..........................................17
Разважанні вераб'я .................................18
Каршун-махінар .....................................19
Муха і павук .......................................21
Сарока і зязюля ....................................23
Пчала і жук ........................................24
Крумкач і салавей ..................................25
Слізняк ............................................26
Скупы чмель ........................................27
Дапамога ...........................................28
Новая вайна ........................................29
Бабёр і піўзавод ...................................31
Верабей-паэт .......................................32
Канфлікт на арэшыне ................................34
Мікроб і слон ......................................35

Абраза ....................................................36
На планеце Уран ....................................................37
Слізняк, арол і вол ....................................................39
Чмель і матылёк ....................................................40
Сава ....................................................41
Бусел і верабей ....................................................43
Бабёр-браканьер ....................................................44
Шчаслівая пара ....................................................46
Лось-лавелас ....................................................48
Ліса-знахарка ....................................................49
Пчаляр, мядзведь і ліса ....................................................51
Пералюбы ....................................................53
Перапала ....................................................55
Дзед і пацук ....................................................57
Куніца і сава ....................................................59
Падхалімка ....................................................61
Дыялог ворана і крата ....................................................63
Дачнік і каларадскі жук ....................................................65
Каршун-ліхадзей ....................................................67
Львы і буйвалы ....................................................69
Караед ....................................................71
Камар-паклёпнік ....................................................74
Чалавек і малпа ....................................................76
Прымак ....................................................78
Ваяўнічы хрушч ....................................................80
Махлярка ....................................................83
Гісторыя з шашком....................................................86

Таракан ..........................................................88
Баравік і мухамор ..........................................90
Карась ..............................................................93
Парады ..............................................................95
Воўк-прадпрымальнік ....................................97
Нупрэй і куры ...............................................101
Бурнос і тэлевізар .........................................104
На Марсе ........................................................106
Янот ..............................................................108
Кот-зомбі ........................................................110
Каршун і крумкач .........................................112
Васьміног і кіт ...............................................114
Ёрш і калючка ...............................................116
Грак і рак ........................................................118
Верабей-палітыкан .........................................120
Яўхім, сабака і блохі .....................................122
Лешч і клешч .................................................124
Сцяпан і баян .................................................126
Верабей .........................................................128
Крапіва і асот .................................................130

Літаратурна-мастацкае выданне

ВАСЬКО
Уладзімір Гаўрылавіч

БАЙКІ

Адказны за выпуск *В.У. Нічыпар*
Кампутарная вёрстка *В. І. Грышко*
Карэктар *А.У. Лапко*

Падпісана да друку 09.03.2026. Фармат 70х90/32.
Папера ColorCopy. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 4,97. Ул.-выд. арк. 4,68.
Тыраж 50 экз. Заказ 560.

12+

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
ГАУПП «Лідская друкарня».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў:
№ 1/281 ад 07.04.2014, № 2/101 ад 09.08.2024.
Вул. Ленінская, 23, 231300, г. Ліда.